У заяве трэба надрукаваць ці напісаць друкаванымі літарамі на англійскай мове наступную інфармацыю: поўнае імя, месца нараджэння, родная краіна заяўніка, імёны мужа/жонкі і дзяцей заяўніка, поўны паштовы адрас, асабісты подпіс і фотаздымак заяўніка (37х37 мм), зроблены нядаўна і прыклеены да заявы празрыстай стужкай (нельга выкарыстоўваць клей ці сашчэпкі). Пераможцаў вызначыць камп'ютэр у адвольным парадку. Усе яны атрымаюць паведамленні ад Нацыянальнага візавага цэнтра вясной — напачатку лета 2000 года.

Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць у ахоўнікаў Пасольства ЗША па адрасе: Мінск, вул. Старавіленская, 46, з 9.00 да 17.00.

Алесь АБРАМОВІЧ.

З жыцця "вертыкальшчыкаў"

Былыя старшыня Веткаўскага райвыканкама і дырэктар саўгаса "Свяцілавічы" прыгавораны судом да чатырох гадоў пазбаўлення волі

Па 4 гады пазбаўлення волі з утрыманнем у калоніі ўзмоцненага рэжыму, канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займаць адказныя пасады тэрмінам на чатыры гады — такі прысуд вынесла судовая калегія Гомельскага абласнога суда былым старшыні Веткаўскага райвыканкама Васілю Воінаву і дырэктару мясцовага саўгаса "Свяцілавічы" Васілю Кудлянкову.

Як раней паведамляў БелаПАН, былыя кіраўнікі абвінавачваліся ў крадзяжах у буйных памерах, незаконным захоўванні стрэльбаў і боепрыпасаў, службовым падлогу, злоўжыванні службовым становішчам, а Кудлянкоў, акрамя таго, — ва ўчыненні злоснага хуліганства і пагрозе забойства. Суд прызнаў віну абодвух абвінавачваемых па ўсіх інкрымінаваных ім артыкулах; толькі па адным з васьмі эпізодаў хуліганства Кудлянкоў быў апраўданы.

Акрамя таго, суд вынес пастанову аб узбуджэнні крымінальнай справы за дачу ілжывых паказанняў у дачыненні да намесніка дырэктара саўгаса "Свяцілавічы" Валянціны Лепшай, якая такім чынам спрабавала змякчыць віну свайго былога начальніка.

Прыватныя пастановы вынесеныя былому першаму намесніку старшыні Веткаўскага райвыканкама Яўгену Чаванькову, які зараз узначальвае раённы Савет дэпутатаў, і інспектару раённага аддзела ўнутраных спраў Уладзіміру Жураву, які займаўся выдачай дазволаў на захоўванне зброі. Пастановы ім вынесеныя за неналежнае выкананне службовых абавязкаў, што садзейнічала ўчыненню злачынстваў з боку асуджаных.

Тэрмін зняволення для Воінава будзе адлічвацца з моманту ўступлення прысуду ў законную сілу, а для Кудлянкова ён лічыцца з 7 сакавіка гэтага года, калі той быў узяты пад варту. Згодна з працэсуальнымі нормамі, Воінаў і Кудлянкоў маюць права на абскарджанне прысуду ў сямідзённы тэрмін.

Ірына МАКАВЕЦКАЯ.

Танны і смачны хлеб у глыбінцы не купіць

Купіць свежага смачнага хлеба ў вясковых магазінах і раней было складана, бо завозілі яго ў крамы не кожны дзень. Цяпер нават і ў райцэнтрах Віцебшчыны людзі незадаволеныя смакавымі якасцямі хлебабулачных вырабаў. У Паставах цана буханкі дасягнула 54 тыс. рублёў, а акраец чорнага хлеба нават у дзень пакупкі атрымоўваецца нейкі сыры, ліпне да нажа і зусім не смачны. Але што могуць зрабіць хлебапёкі, калі на мясцовы хлебакамбінат перастала паступаць якасная мука з патрэбнай колькасцю клейкавіны. Высакасортнай пшанічнай мукі не мае і Пастаўскае хлебапрыёмнае прадпрыемства. Наўрад ці зменіцца сітуацыя з хлебам да лепшага, бо вядома, як істотна сёлета зменшыўся ў краіне валавы збор зерня.

Уладзімір РАМАНУЧУК.

Упадабалі немцы нашыя прысмакі

Тое, што ў Беларусі, нягледзячы на ўсе цяжкасці і забароны, прыватны бізнес пакрыху развіваецца, гаворыць толькі аб яго вялікім нявыкарыстаным патэнцыяле. З сярэдзіны 90-х гадоў быў вядомы ў Глыбокім навукова-тэхнічны цэнтр "Эрго", які распрацоўваў і манціраваў лініі па перапрацоўцы сельгаспрадукцыі. Затым яго кіраўнік Анатоль Брылёнак стварыў на базе пустуючага ангара райпрамтэхнікі новую фірму "Аржаніца". І ўжо неўзабаве яе прадукцыю — ягады з цукрам, салёныя грыбочкі, натуральнае дражэ "Журавінка" і іншыя прысмакі — палюбілі спажыўцы вобласці, Мінска і Магілёва, шэрагу абласцей Расіі, а таксама ў санаторыях нарачанскай зоны. Бягучым летам удалося выйсці з лепшымі гатункамі і на пераборлівы рынак Германіі, што дазволіла займець 12 новых працоўных месцаў. У бліжэйшай перспектыве ёсць задумкі сур'ёзна заняцца грыбамі, тым больш, што яны масава пайшлі расці ў лясах.

Уладзімір ШЫТАЎ.

Стоп-кадр

Механизатор готовит себе "козью ножку" из папиросных окурков в одном из колхозов Червенского района (август 1999 г.). Он признался, что для покупки сигарет денег не хватает.

Фото IREX/ProMedia.

Ну і ну!

Напомнілі пасажырам, хто жыве з прывілеямі

Ля трох касавых вакенцаў у зале чакання чыгуначнага вакзала ў Слуцку хіба што ў выхадныя дні ўбачыш раніцой рэдзенькія чэргі. Пасажыры, пераважна дачнікі, грыбнікі, жыхары горада, што едуць у вёску на ўборку бульбы, бяруць білеты на дызель-цягнікі Салігорск—Асіповічы, Слуцк—Баранавічы. Хто не паспее — абілецяць кандуктары ў вагоне. Ды і на цягнік Салігорск—Масква білет купіць можна ў любы дзень свабодна.

Тым не менш не так даўно над вакенцамі кас з'явіліся надрукаваныя буйным шрыфтам па-руску абвесткі з напамінкам случчанам і іх гасцям, што дэпутаты Нацыянальнага сходу і Палаты прадстаўнікоў Рэспублікі Беларусь абслугоўваюцца без чаргі. Ну, хто, скажыце, успомніў бы пра тых дэпутатаў, калі б не гэтыя абвесткі?! Тым болей што ад Слуцка ў Нацыянальным сходзе прадстаўляе інтарэсы выбаршчыкаў усяго адзін дэпутат, які ездзіць па патрэбе ў Мінск маршрутным аўтобусам. Але ж камусьці ў "вертыкалях" сталіцы закарцела нагадаць пра сваіх дэпутатаў хоць праз абвесткі. Ведай нашых!

Мікола КУТНЯВЕЦКІ.
г. Слуцк.

Чаму папсаваліся каўбасы і мяса

Праблемам сістэмы спажыўкааперацыі было прысвечана пазачарговае пасяджэнне Магілёўскага аблвыканкама, якое адбылося днямі. Абмяркоўвалася, у прыватнасці, сітуацыя, пры якой стала магчымым псаванне адной тоны каўбасы на складзе Магілёўскага кааператыўна-нарыхтоўчага гандлёвага прадпрыемства і дзвюх тон мяса ў халадзільніках Чаўскага раённага спажывецкага таварыства. У пасяджэнні ўзяў удзел старшыня праўлення Белкаапсаюза Віктар Уладыка.

Галоўнай прычынай масавага псавання мясных прадуктаў у кааператараў была названа адсутнасць неабходнага кантролю кіраўнікоў аблспажыўсаюза над падпарадкаванымі арганізацыямі. В.Уладыка не выключыў магчымасці таго, што пасля высвятлення ўсіх абставінаў інцыдэнту могуць адбыцца кадравыя змяненні ў кіраўніцтве Магілёўскай абласной сістэмы спажыўкааперацыі. Праўда, канкрэтных прозвішчаў пры гэтым названа не было.

Сёння пасаду старшыні Магілёўскага аблспажыўсаюза займае Георгій Скрыба; ягоны першы намеснік — Леанід Ражкоў. Падчас падвядзення вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці за першае паўгоддзе праца аблспажыўсаюза па забеспячэнні вяскоўцаў спажывецкімі таварамі была прызнана нездавальняючай.

Канстанцін УВАРАЎ.

Открытым текстом

Золото партии?

Для тех, кто не читал первые две части цикла "Золото партии?", *("Народная воля" от 12 августа и 4 сентября 1999 г.)* вкратце повторю их содержание.

Солигорчанин Сергей Болотов присвоил государственное имущество стоимостью в 600 тысяч долларов. Стоило мне отметить этот его "подвиг" газетными публикациями, как "обидевшийся" Болотов побежал в солигорскую межрайпрокуратуру с заявлением о том, что я, дескать, вымогал у него деньги. Разборка со мной была поручена инспектору местного уголовного розыска Сергею Давыденко, который стал настойчиво требовать моего выезда в Солигорск, хотя требование его никак не стыковалось с законом.

Охота на ведьм

Мое обращение в МВД порядком остудило пыл ретивого зазывалы и, не солоно хлебавши, он приехал ко мне сам. Наш с ним разговор состоялся в редакции "Народной воли". Записывая мои объяснения, инспектор два часа страстно убеждал меня в том, что я, дескать, вымогал у Болотова деньги и должен в этом сознаться. Присутствие вокруг моих коллег по редакции ничуть не стесняло экспансивного визитера в выборе самых пикантных выражений, но мои ответы на них путали обличителю все карты. Записывая то, что я говорил, инспектор мрачнел с каждой минутой. А когда он закончил свои каллиграфические упражнения и предложил мне поставить свой автограф под сочиненным им чтивом, я дописал к нему целую страницу, вобравшую в себя те мои слова, которые инспектор упорно не хотел вносить в текст объяснения. После этого гость из Солигорска, который по приезде просто олицетворял собой бодрость и оптимизм, покинул редакцию словно в воду опущенный. Он увез с собой документ, из-за которого правоохранителям пришлось отказаться от всех своих потуг уличить меня хоть в чем-то нехорошем. Уголовного дела по обвинению меня в рэкете так и не получилось. Но не будем хлопать по этому поводу в ладоши и говорить о торжестве закона.

Недавно блюстители закона озадачили уголовными делами двух солигорчан, которых весь город знает как честнейших и достойнейших людей. Бедолаг, которые, к несчастью, знают слишком много, заподозрили в том, что они передали мне информацию о "подвигах" местной милиции. Чтобы лишний раз не травмировать этих людей и их родственников, я пока не буду называть имен кандидатов в преступники. Скажу лишь о том, что на новоиспеченных "злодеев" пытаются повесить события пятилетней и полуторагодовой давности, в которых никогда не было ни тайны, ни криминала, а содержание обвинений здорово смахивает на сюжет знаменитой сказки про белого бычка. Впрочем, об этом предстоит еще отдельный разговор, после которого некоторые милицейские чины своих чинов лишатся.

Судя по всему, в Солигорске началась настоящая охота за теми, кто подозревается в передаче мне информации для публикуемых мною статей. Об этом говорят даже звонки в редакцию "Народной воли", последовавшие после выхода первых двух частей цикла "Золото партии?". Вовсе несложно отличить голоса настоящих читателей от голосов эмиссаров, обеспокоенных моими статьями "тузов". Недавно мне позвонила женщина, которая вылила ушат грязи на моего предполагаемого информатора. В завершение своего страстного монолога она посоветовала мне никаких дел с этим человеком не иметь и держаться от него подальше. А вслед за ней протелефонировал мужичок, который стал очень живо интересоваться тем, кто дает мне сведения для статей и намерен ли я в них "громить" руководство местного горисполкома. Такие вот звонки и звоночки стали повторяться изо дня в день.

Должен огорчить солигорских начальников пренеприятнейшим известием. Немало потрудившись, я раздобыл доказательства чудовищной коррумпированности этого региона и передал их в Совет Безопасности. Признаюсь, что с большим трудом удержал себя от соблазна опубликовать собранные мною сведения в этом номере газеты, ибо от них обалдела бы не только Солигорщина, но и вся Беларусь. Но накануне предстоящей проверки Совбеза было бы непростительной ошибкой раскрыть карты перед теми, кто сейчас лихорадочно прячет от посторонних глаз плоды своих "героических" свершений. Но, как известно, шила в мешке не утаишь. Результаты проводимых в Солигорске проверок будут подробно освещаться в нашей газете. Здесь же будет опубликован подготовленный мною цикл статей, посвященных весьма экстравагантным поступкам высоких чиновников из Любанского района. Так что, уважаемые читатели, не забудьте до 20 сентября оформить подписку на "Народную волю!".

Сергей НАВОЕВ.

Независимая экспертиза

От изобилия — к голоду

(Окончание. Начало на 1-й стр.)

Наше государство одной рукой отнимает заработанное селом, другой — возвращает мизерную часть в виде сезонных подачек. Правительство Республики Беларусь, как всегда, делает все наоборот, и потому получается не как у всех, а "коленками назад". Особенно это практикуется в последние 5—6 лет. Вот этому пример. Произведенную продукцию — мясо и молоко, от которых выручка составляет более 70% денежных поступлений от всей реализации села, государство забирает по фиксированным заниженным ценам, а конкретнее — за половину розничной магазинной цены. Итак, если госхоз, колхоз, крестьянин получает только половину за выращенное мясо, надоенное молоко, то куда же девается другая половина денег, вырученная магазином? Вот куда: до 7—8% получает мясокомбинат и молочный завод за переработку, до 12—15% — магазин за то, что продал, а остальные, примерно 30-35%, забирает государство. А куда эти заработанные селянами деньги уходят, знают только наши руководители государства. Можно только предположить — возможно, на покупку в России новых МИГов, возможно, на мизерную зарплату проигравшему весь рабочий день в домино рабочему, чтобы, не дай Бог, не вышел на улицу. Трудно сказать. Дыр в кошельке нашего государства много. Надо же содержать 125 тысяч человек милиции и 85 тысяч армии, не говоря уже о постоянно растущей громадной армии контролеров и государственных чиновников.

Таким образом, у нас в Беларуси государство не создает нормальных условий для производительного труда сельских людей, а наоборот, только заставляет их дотировать государство. Экономисты подсчитали, что через фиксированные государством заниженные закупочные цены на основные виды сельхозпродукции и свободные цены на технику, строительные материалы, минеральные удобрения, ядохимикаты и другие необходимые для сельскохозяйственного производства ресурсы, государство ежегодно получает примерно в 4 раза больше, чем выделяет через все государственные субсидии вместе со всеми внебюджетными фондами поддержки производителей сельскохозяйственной продукции и сезонными подачками. Так что постоянные упреки в виновности сельского хозяйства в том, что государство несет на себе груз финансового бремени по его поддержке, не соответствуют действительности. Поэтому, для того чтобы не допустить дальнейшую гибель сельхозпроизводителя, необходимо дать право ему самому устанавливать цену на свою продукцию и самому решать, кому ее продать. А если этим хочет заниматься государство, то оно обязано установить закупочную цену на сельхозпродукцию в таких размерах, чтобы покрыть расходы на ее производство и дать возможность получить хотя бы 15—20% прибыли на воспроизводство отрасли.

Тогда в магазинах розничные цены на мясные и молочные продукты снизятся примерно на 30—35% за счет перераспределения выручки между сельхозпроизводителями, переработчиками и торговлей, а также за счет конкуренции сельхозпроизводителей.

Многолетняя абсурдная государственная политика по отношению к селу привела к тому, что ежегодно падает валовое производство сельскохозяйственной продукции, не обновляются производственные фонды, на 90% устарела и износилась техника, катастрофически падает плодородие почв, наполовину снизилась урожайность полей, на закате — семеноводство и племенное дело, систематически сокращается поголовье крупного рогатого скота, коров и свиней. Ежегодно сокращается производство и реализация продуктов животноводства. Уже появилась проблема с продуктами не только в регионах, но и в Минске: нельзя купить в магазине масло, сыр, молоко и другие молочные и мясные продукты.

Еще более мрачное будущее села впереди. В текущем году получена самая низкая урожайность зерновых за последние 20 лет — около 17,0 ц/га, валовое производство зерна немного более 3,5 млн. тонн, примерно на 20% меньше по сравнению с прошлым "неблагоприятным" годом заготовлено кормов.

Нужны дополнительно сотни тысяч долларов США для закупок концентрированных кормов, чтобы поддержать производство продукции животноводства на уровне прошлого года. В текущем году, проедая собственные оборотные фонды, госхозы и колхозы продолжают отдавать государству за половину цены молоко и мясо. Понятно, что такая политика губит экономику сельхозпредприятий. В настоящее время крестьяне обеспечены оборотными средствами только на одну треть от требуемого.

В итоге, они не могут купить горючее, минеральные удобрения и ядохимикаты, не говоря уже о новой технике. Все последние годы село работает "с колес". Недостаток техники, ее физический и моральный износ, низкая, а кое-где мизерная, обеспеченность минеральными удобрениями способствуют нарушению сроков полевых работ и технологии возделывания сельскохозяйственных культур. Чтобы оправдать бесхозяйственность и уродство существующей по отношению к селу политики государства, его идеологи и апологеты придумывают разного рода причины, оправдывающие получение низкой урожайности, типа весенних паводков, засух, изобилия дождей и т.д.. В самом деле, прошлый год был с обильными дождями, и это то, что надо белорусским почвам, может быть, кроме отдельных районов Витебской области. Но кормов не заготовили и объяснили это избытком дождей. В текущем году было много солнечных дней, недостаточно осадков в летние месяцы — и тоже не заготовили кормов. А если посмотреть на этот вопрос объективно, то надо сказать, что в нашей Беларуси почти все годы такие. Сельское хозяйство Беларуси все время работает в таких условиях, т.к. она находится в такой климатической зоне. И кадры руководителей и специалистов-технологов это понимают и умеют работать в таких природных условиях. А вот в созданных государством экономических условиях работать они не могут, т.к. они — невыносимые. В такой кабале не смогли бы работать специалисты ни одного европейского государства. Наше государство ищет дураков, которые бы работали за скудную, мизерную зарплату и себе в убыток. В текущем году соседняя Литва, где уже несколько лет нет колхозов, площадь зерновых культур у которой составляет примерно 30% от посевных площадей Беларуси, собрала более 2 млн. тонн зерна, а мы только 3,5 млн. тонн. Там в магазинах изобилие всех продуктов питания, цены на которые ниже наших. Видите ли, в Литве трава и зерно выросли, а у нас — нет. Что, там климат другой?

"Мудрое" руководство селом привело к тому, что вместо планируемого роста в первом полугодии произошло падение сельскохозяйственного производства: мяса на 4% и на 10% молока. Такого рекордно низкого уровня зерновых и сбора зерна наша Беларусь не знала за последние 20 лет.

Все это, естественно, скажется на финансовом состоянии хозяйств. Кредиторская задолженность их уже превысила 110 триллионов рублей и оказалась более чем в два раза выше дебиторской. Причем долги стремительно растут. По данным Министерства сельского хозяйства и продовольствия, в первом полугодии убыточными оказались около 40% сельхозпредприятий. Отсюда — постоянные задержки с выплатой и без того мизерной зарплаты, огромные задолженности хозяйств за энергоресурсы, минеральные удобрения, горюче-смазочные материалы. Почти в два раза по сравнению с прошлым годом выросло количество неплатежеспособных предприятий.

Итак — ясно, что при существующей политике государства в области сельскохозяйственного производства и вообще всего агропромышленного комплекса обеспеченность продуктами питания населения поставлена под угрозу. Их категорически не хватает для обеспечения собственного народа. А при умелом, разумном хозяйствовании мы не только можем обеспечить основными продуктами питания себя, тем самым обеспечив продовольственную безопасность государства, но и значительную часть их продавать за пределы государства и получать валюту. Но для этого мало одних желаний, а, очевидно, нужно реформирование производственных отношений, т.к. повсеместно видна одна беда — крестьяне даром работать не хотят, отсюда — отношение к коллективной собственности по принципу "все вокруг колхозное, все вокруг мое". В существующей системе колхозно-совхозного производства нет мотивов, побуждающих к труду, ни у рядовых рабочих, механизаторов, доярок, ни даже у руководителей и специалистов хозяйств.

Почти все кадры руководителей и специалистов на селе, не говоря уже о рядовых тружениках, работают под гнетом, не за совесть, а за страх. Особенно этот стиль запугивания, устрашения кадров характерен в последние годы. Недоверие руководства республики к руководителям хозяйств, постоянное унижение и устрашение их на примере суда над лучшими организаторами сельскохозяйственного производства страны Героем Социалистического Труда В. Старовойтовым, другими инициативными и рачительными хозяевами привели к тому, что преобладающее большинство кадров руководителей и специалистов сельхозпроизводства в настоящее время находятся в состоянии отчаяния, безысходности и апатии. И большинство из них работает только потому, что когда-то, по призванию, решили связать свою судьбу с сельским хозяйством. Стиль и методы работы нынешнего режима, управление работой кадров через декреты и бесконечные проверки контрольных органов и государственных чиновников сковали инициативу и творчество руководителей и специалистов. Все это привело к тому, что имеем. Так дальше работать нельзя. Нужны перемены.

Давно уже специалистами подготовлен ряд проектов рыночных законов, направленных на раскрепощение сельскохозяйственного производителя, позволяющих вывести агропромышленный комплекс из затянувшегося кризиса, сделать его не только самоокупаемым, но и высокорентабельным и привлекательным. Предполагается организовать сельскохозяйственное производство так, как это сделано в Литве, Польше и других развитых европейских государствах одной климатической зоны.

(Аналитическая группа "Z").

Из первых уст

Фидель Кастро еще и специалист по допинг-контролю?

Фидель Кастро демонстрирует результаты допинг-проб штангистов Кубы.

Кубинский лидер Фидель Кастро встретился с журналистами и изложил им факты, свидетельствующие: сборная карибской республики по тяжелой атлетике – жертва заговора на прошедших Панамериканских играх в Виннипеге.

Как известно, 3 кубинских штангиста – призеры этих соревнований – были дисквалифицированы по итогам допинг-контроля: в их моче обнаружен анаболик. На высшем уровне – спорт на Кубе считается вопросом государственной важности – было решено сразу после прибытия атлетов домой заново взять у них образцы анализов и отправить их на независимую экспертизу в лаборатории Испании и Португалии. Исследования образцов, закодированных так, что их принадлежность могли установить только 3 человека, включая Фиделя Кастро, дали отрицательный результат. Между тем нандролон, о котором и шла речь в Канаде, выявляется при исследовании в течение минимум 6 месяцев после инъекции.

Кубинские специалисты с выкладками изменения веса атлетов за последние 11 месяцев доказывают: о применении анаболиков, вызывающих резкий прирост мышечной массы, не могло быть и речи. На встрече с журналистам в качестве одного из доказательств предвзятости канадской лаборатории был представлен документ о наличии у кубинского атлета в организме анаболика, подписанный... до того, как спортсмен сдал анализы. Между тем положительные результаты тестов у 3 спортсменов могут повлечь дисквалификацию сборной Кубы, которая автоматически лишится путевки на Игры в Сиднее.

Были представлены и факты, свидетельствующие о ряде нарушений при исследовании анализов рекордсмена мира в прыжках в высоту Сотомайора, лишенного золотой медали из-за положительного результата теста на наличие в организме кокаина. Кубинская сторона настаивает: один из знаменитых спортсменов стал жертвой грязной провокации. Доказать здесь злой умысел сложнее – кокаин быстро выводится из организма, и повторные анализы бессмысленны. Случай же с результатами допинг-контроля у тяжелоатлетов, опровергнутыми европейскими лабораториями, Фидель Кастро без обиняков назвал идиотизмом.

Газета — чытач

Прабачце за недакладнасць

У мінулым нумары газеты з-за недагляду карэктуры, на жаль, дапушчана недарэчнасць. На трэцяй старонцы пад загалоўкам "Белград направляет в Косово экстремистов" змешчана зусім іншая заметка. Яе загаловак — "Шпионаж в пользу СССР."

Просім прабачэння ў чытачоў.

Хиллари наконец обрела нью-йоркскую прописку

Супружеская чета Клинтонов купила-таки дом, соблюдя одновременно все формальности и решив квартирный вопрос. По законам штата Нью-Йорк (от которого первая леди собирается выставить свою кандидатуру на сенаторских выборах), чтобы быть включенной в списки для голосования, должна иметься нью-йоркская «прописка». Да и после окончания срока президентства Клинтона переезжать из Белого дома тоже куда-то было нужно. В минувший четверг Клинтоны подписали контракт на покупку дома стоимостью 1,7 миллиона долларов.

Особняк расположен в округе Уэстчестер на окраине городка Чаппакую, что в 60 километрах от центра Манхэттена. Новое место жительства Клинтонов представляет собой двухэтажный обшитый деревом дом, кстати, тоже белого цвета, построенный в 1889 году. В нем 11 комнат, включая пять спален, четыре ванные, мансарду и подвал, где может быть устроен небольшой спортивный зал. Среди прочих удобств – два камина, гараж на две машины, бассейн. Общая площадь участка – 0,4 гектара. Недалеко расположены площадки для гольфа – любимой игры Билла Клинтона. По словам пресс-секретаря Белого дома Джозефа Локхарта, президент и его жена очень довольны приобретением. Не вызвал особняк нареканий и со стороны секретной службы, которая провела его тщательный осмотр на предмет безопасности.

Для покупки дома Клинтон займет 1,3 миллиона долларов сроком на пять лет у финансовой корпорации «Банкерс траст». А гарантом займа выступит старый друг президента Терри Маколифф. Супругам придется ежемесячно выплачивать 9,7 тысяч долларов по займу и, кроме того, платить ежегодный налог на недвижимость в размере около 26 тысяч долларов. Президента, однако, такая перспектива не пугает. «У меня будет хорошая пенсия. К тому же я собираюсь попробовать себя в новом качестве», – цитирует слова Клинтона журнал «Нью-Йоркер».

Клинтонам ссудят 1,3 миллиона долларов под гарантии друга президента Терри Маколиффа (на снимке в центре). ("НИ")

Эврика!

Появление противораковых лекарств

Сотрудники Онкологического института имени Битсона в шотландском городе Глазго идентифицировали белок, изучение которого может ускорить появление новых противораковых лекарств. Этот протеин останавливает один из этапов клеточного деления, блокируя действие ферментов, которые обеспечивают этот процесс химической энергией. Ученые полагают, что выяснение биохимического функционирования этого протеина приблизит создание препаратов, способных пресекать бесконтрольное размножение раковых клеток.

Прививки против инфекционных болезней

В Стэнфордском университете выполнены эксперименты, подтвердившие возможность проведения прививок против инфекционных заболеваний путем нанесения вакцины на кожный покров. Дерматолог Пол Хавари и его ассистенты смазывали кожу подопытных мышей раствором изолированной ДНК вируса сывороточного гепатита. В результате у животных возникала иммунная реакция, хотя и более слабая, чем после применения обычных вакцин. Аналогичные результаты были получены и при наружной вакцинации белком, выделенным из патогенных штаммов кишечной палочки.

Протезы из геля

Гидрогель — полимерный материал, из которого делают мягкие контактные линзы, можно использовать и для изготовления искусственных суставов. Давид Ку — хирург с инженерным дипломом из университета Эмори в Атланте нашел возможность увеличить механическую прочность этого полимера. Модифицированный гидрогель, получивший название Salubria, наполовину состоит из воды, как и обычный хрящ. Он обладает высокой амортизирующей способностью и может применяться для замены поврежденных межпозвоночных дисков, а также коленных и тазобедренных суставов. Опыты на животных показали, что протезы из этого материала обладают высокой биологической совместимостью и не отторгаются иммунной системой. Клинические испытания геля начнутся в течение ближайших трех лет.

Надувной жилет спасет от беды

Японская фирма Kajima разработала надувной жилет, предохраняющий рабочих-строителей от ушибов и производственных травм. Если человеку в таком жилете случится поскользнуться и упасть, автоматически включится датчик, регистрирующий быстроту падения. Как только скорость окажется выше установленной границы, жилет мгновенно раздуется и накроет воздушной подушкой тело пострадавшего.

Група вядомых дзеячаў беларускай навукі і культуры звярнулася да кіраўніка ўрада з патрабаваннем спыніць руйнаванне помнікаў архітэктуры ў краіне

Група вядомых дзеячаў навукі і культуры Беларусі звярнулася з адкрытым лістом да кіраўніка ўрада краіны Сяргея Лінга. Яны выказваюць трывогу адносна знішчэння і сур"ёзнага пашкоджання ў апошнія гады выдатных помнікаў айчыннай гісторыі і культуры — "аўтэнтычных частак Дабравешчанскай царквы ў Віцебску, будынка царквы ў Заслаўі, археалагічнага пласта Гандлёвай плошчы ў Навагрудку" і іншых.

На погляд аўтараў звароту, катастрафічная сітуацыя склалася з захаваннем гістарычнай забудовы ў сталіцы Беларусі — "цэлы шэраг рэдкіх і унікальных аб"ектаў Мінска быў знішчаны ў апошнія гады у працэсе работ у Верхнім горадзе закрытага акцыянернага таварыства "Стары Менск". Сярод такіх аб"ектаў названыя будынкі па вуліцах Герцэна, Інтэрнацыянальнай /дом Манюшкі/, Музычным завулку, у Ракаўскім прадмесці, дзе адбываецца знос помнікаў, якія знаходзяцца пад аховай дзяржавы, іншых каштоўных будынкаў.

Зараз, адзначаецца у лісце, асаблівую трывогу выклікае лёс будынкаў унікальнага комплексу малога гасціннага двара на плошчы Свабоды, дома па вуліцы Рэвалюцыйнай, 14, які звязаны з жыццём і творчасцю вядомага паэта і драматурга В. Дуніна-Марцінкевіча, знос "каштоўнай часткі Верхняга горада і дамоў па вуліцы Камсамольскай, якія знаходзяцца пад дзяржаўнай аховай.

Аўтары ліста просяць кіраўніка ўрада раскрыць для грамадскасці інфармацыю аб дзейнасці ЗАТ "Стары Менск" у гістарычным цэнтры сталіцы; змяніць форму ўласнасці закрытага акцыянернага таварыства для магчымасці шырокага ўдзелу грамадзян у зберажэнні і аднаўленні помнікаў роднага горада; прыцягнуць да адказнасці кіраўніцтва Камітэта па ахове гісторыка-культурнай спадчыны пры Міністэрстве культуры Беларусі, іншых чыноўнікаў, вінаватых у бяздзейнасці і санкцыянаванні разбурэння помнікаў; спыніць руйнаванне і правесці навуковую рэстаўрацыю помнікаў архітэктуры ў Мінску, Навагрудку, вёсках Забалацце і Драчкава Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці.

Адкрыты ліст, тэкст якога падрыхтаваны каардынатарамі грамадзянскай ініцыятывы Аляксеем Галічам і Аляксеем Фраловым, падпісалі 37 вядомых асоб, сярод якіх — Ігар Алоўнікаў, Анатоль Багатыроў, Янка Брыль, Гаўрыіл Вашчанка, Ігар Дабралюбаў, Аляксандра Клімава, Стэфанія Станюта, Міхаіл Фінберг, Расціслаў Янкоўскі і іншыя дзеячы айчыннай навукі і культуры.

Юрый КУЗНЯЦОЎ.

У Віцебскай вобласці будуецца цэнтр па ўтылізацыі авіяцыйных бомб сярэдняга калібру

Тона тратылу штодзённа — на такі аб'ём выпуску гэтай выбухованебяспечнай прадукцыі разлічаны цэнтр утылізацыі авіяцыйных бомб сярэдняга калібру, які будуецца непадалёк ад склада боепрыпасаў на тэрыторыі ваеннай часці N 94017.

Паводле звестак БелаПАН, аб'ект знаходзіцца не ў Віцебску, як паведамлялася 7 верасня на прэс-канферэнцыі ў Міністэрстве абароны рэспублікі, а ў 600 метрах ад пасёлка Прудок, каля раённага цэнтра Гарадок. Менавіта гэтыя 600 метраў і з'яўляюцца той санітарна-абароннай зонай (САЗ), якая, па задуме будаўнікоў аб'екту, павінна забяспечыць яго бяспеку для людзей — жыхароў таго ж Прудка, а таксама сяла Паташні і іншых блізкіх населеных пунктаў. Менш чым у палутара кіламетрах ад аб'екту знаходзіцца і чыгуначная станцыя "Прудок", што на санкт-пецярбургскім накірунку.

Адыходы новай вытворчасці будуць спальвацца на спецыяльнай пляцоўцы. У дапушчальных межах прадугледжаны выкід у атмасферу пароў трынітраталуолу, парафіну і двувокісу серы, якія суправаджаюць утылізацыю бомбаў. У размове з карэспандэнтам БелаПАН добра інфармаваная крыніца паведаміла пра дзесяткі тысяч тон складзіраваных тут боепрыпасаў. Іх утылізацыя, такім чынам, расцягнецца на дзесяткі гадоў.

Леанід СІМАНАЎ.

У НАНБ завяршаецца прыём заяў у аспірантуру

У інстытутах Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (НАНБ) у сярэдзіне верасня завяршаецца прыём заяў у аспірантуру, дзе з 24 па 30 верасня пройдуць уступныя іспыты паводле выбраных заявіцелямі спецыяльнасцях. Да канца кастрычніка павінны быць праведзеныя ўступныя іспыты па замежнай мове і філасофіі. Пра гэта паведаміла БелаПАН намеснік начальніка аддзела кадраў НАНБ Людміла Сакалова. Як растлумачыла Л.Сакалова, якая курыруе ў НАНБ сектар аспірантуры, ад цяперашняга набору выпускнікоў ВНУ і маладых вучоных у шэрагі аспірантаў шмат у чым будзе залежыць, як пойдзе аднаўленне навуковых кадраў, бо ў 1998 годзе ў Акадэмію было прынята на працу толькі 68 маладых спецыялістаў. Паказчыкамі "старэння" галоўнай дзяржаўнай установы па фундаментальнай навуцы з'яўляецца таксама і тое, што сярэдні ўзрост кандыдата навук у НАНБ, паводле звестак 1998 года, складае 48 гадоў, доктара навук — 58, члена-карэспандэнта НАНБ — 64 гады, акадэміка — 67 гадоў.

Адказны кадравы работнік НАНБ адзначае як станоўчую тэндэнцыю некалькіх апошніх гадоў вяртанне да навукова-даследчай працы тых, хто некалі вымушаны быў пакінуць навуку і заняцца камерцыяй. "Камерцыйная ініцыятыва сярод вучоных згортваецца", — сказала Л.Сакалова. І гэта звязана, на яе думку, з усведамленнем каштоўнасці постдыпломнай адукацыі.

Уладзімір ТРАЦЦЯКОЎ.

Сумесны беларуска-расійскі Белгазпрамбанк павялічвае свой статутны фонд да 6 мільёнаў еўра

А.Лукашэнка падпісаў распараджэнне аб унясенні беларускім урадам дадатковага ўкладу ў статутны фонд сумеснага беларуска-расійскага адкрытага акцыянернага таварыства "Белгазпрамбанк".

Паводле звестак БелаПАН, у якасці ўкладу ўносіцца дзяржаўная маёмасць у выглядзе памяшканняў агульнай плошчай звыш за 1,5 тысячы квадратных метраў і коштам больш за 1,5 мільёна еўра. Акрамя таго, вядома, што рашэнне аб унясенні ў статутны фонд банка 3,5 мільёна еўра прынялі і расійскія акцыянеры — ААТ "Газпрам" і КБ "Газпрамбанк". У выніку праведзення ўказаных дзеянняў статутны фонд "Белгазпрамбанка" складзе больш за 6 мільёнаў еўра пры ўстаноўленым Нацбанкам Беларусі нарматыве для банкаў з удзелам замежнага капіталу фондзе ў памеры 5 мільёнаў еўра.

Даведка БелаПАН. "Белгазпрамбанк" зарэгістраваны Нацыянальным банкам Беларусі напрыканцы 1997 года, мае генеральную ліцэнзію. Расійскім акцыянерам — ААТ "Газпрам" і КБ "Газпрамбанк" — належыць па 35 працэнтаў акцый. Найбольш буйнымі ўладальнікамі акцый з беларускага боку з'яўляюцца дзяржпрадпрыемства "Белтрансгаз" і Міністэрства па кіраванні дзяржаўнай маёмасцю і прыватызацыі.

Ягор ЗВОННІКАЎ.

У Беларусі ЕБРР удзельнічае ў рэалізацыі шасці праектаў; пазычальнікам выплачана 147 мільёнаў еўра

Сёння Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця (ЕБРР) удзельнічае ў Беларусі ў рэалізацыі шасці праектаў; пазычальнікам выплачана 147 мільёнаў еўра. Такія звесткі паведаміў прадстаўнік тэрытарыяльнага аддзела па працы з Беларуссю ЕБРР Марэк Лорынк у сваім дакладзе на міжнародным эканамічным форуме "Еўропа" ў Мінскім адукацыйным цэнтры.

Ён адзначыў, што рэалізуемая колькасць праектаў у Беларусі не такая вялікая, як хацелася б кіраўніцтву ЕБРР, і банк не з'яўляецца самым буйным інвестарам у рэспубліцы. Пераважная большасць рэалізуемага банкам у Беларусі фінансавага партфеля — 98 працэнтаў — складаюць прамыя крэдыты і толькі 2 працэнты — укладанні ў акцыі. Пры гэтым інвестыцыі ў прыватны сектар беларускай эканомікі складаюць пакуль 24 працэнты, 76 — у дзяржаўны. Аднак у цэлым еўрабанк імкнецца атрымаць ў сваёй працы іншых прапорцый.

"Наша галоўная задача ў Беларусі — дамагчыся суадносінаў 60 працэнтаў да 40 на карысць прыватнага бізнесу", — заявіў спадар Лорынк, адзначыўшы пры гэтым, што ў большасці краін, з якімі супрацоўнічае ЕБРР, гэтыя суадносіны дасягнутыя. Аналіз партфеля праектаў ЕБРР у Беларусі па галінах паказвае, што асноўны акцэнт робіцца на прамых інвестыцыях у фінансавыя ўстановы, куды ўкладзена амаль трэцяя частка ўсіх сродкаў. "Мы ўжо шмат чаго дасягнулі тут, але яшчэ шмат плануем зрабіць", — сказаў Марэк Лорынк. Цяперашнія прыярытэтныя накірункі дзейнасці еўрабанка ў Беларусі звязаныя, паводле ягоных слоў, з паскарэннем развіцця прыватнага сектару і накіраваннем фінансавых сродкаў у першую чаргу ў гэтую сферу. У сваёй далейшай працы ў краіне ЕБРР збіраецца выкарыстаць патэнцыял многіх беларускіх прадпрыемстваў, нізкі кошт беларускага экспарту, блізкасць да еўрапейскага рынку, мытны саюз з Расіяй, высокаадукаваную і кваліфікаваную рабочую сілу.

Аляксей АРЭШКА.

Вярхоўны суд зацвердзіў прысуд Гомельскага абласнога суда аб пажыццёвым зняволенні жыхара Кармянскага раёна М.Багдановіча

Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь зацвердзіў першы ў Гомельскай вобласці прысуд аб пажыццёвым зняволенні злачынцы. 30-гадовы Мікалай Багдановіч, жыхар вёскі Багдановічы Кармянскага раёна Гомельскай вобласці, быў тройчы асуджаны за крадзяжы, злоснае хуліганства і рабаўніцтва — прычым усе гэтыя злачынствы ён учыняў у дачыненні да жанчын. Летась увосень М.Багдановіч з асаблівай жорсткасцю забіў маладую жанчыну-аднавяскоўку, пасля чаго пра яго ў вёсцы казалі толькі як пра маньяка. Аднавяскоўцы літаральна атакавалі суд лістамі з просьбамі ніколі не выпускаць злачынцу з-за кратаў, з тым каб "гэты кашмар не паўтарыўся".

У выніку судовая калегія Гомельскага абласнога суда прызнала М.Багдановіча "асоба небяспечным рэцыдывістам" і вынесла яму прысуд — пажыццёвае зняволенне. Вярхоўны суд у адказ на касацыйную скаргу злачынцы пакінуў гэты прысуд без змяненняў.

Ірына МАКАВЕЦКАЯ.

Тусоўка

"Навінкі-99" як крык паднявольных людзей

Знамянальным фактам беларускага культурнага жыцця стала нядаўняя імпрэза ў сталічным Палацы мастацтва. Еўрапейскі постмадэрнісцкі перфоманс, узнікшы ў сярэдзіне XX стагоддзя, сёння прыйшоў на Беларусь. Адбылася арыгінальная акцыя. Першы міжнародны фестываль "Навінкі-99".

Што такое перформанс? Слова для нас яшчэ не зусім звычнае. Гэта сінтэтычны від сучаснага мастацтва, які па вытоках даволі блізкі да тэатральнага дзейства. Перформанс можа быць пастаўлены як асобным выканаўцам, так і творчым калектывам. Важную ролю адыгрываюць у ім творы прыкладнога мастацтва (адзенне, аксесуары), музыка, іншым разам творы жывапісу. Абавязковым элементам з'яўляецца імправізацыя. Звычайна перфомансы робяцца "на голым энтузіязме". Як правіла, удзельнікі не атрымліваюць ганарары за выступленні. Падтрымка фундатараў — з'ява таксама маларасаўсюджаная.

Першыя перформансы падчас нагадвалі карнавальныя гулянні народа на вуліцы, але найчасцей былі звязаны з сур'ёзнымі палітычнымі акцыямі моладзі (антываенныя, антыядзерныя дэманстрацыі і мітынгі). Трыумф заходнееўрапейскага перформансу прыпадае на 60—70-я гады; тады гэты від мастацтва пранік і ў маленькія гарады, і ў мястэчкі...

"Навінкі-99" сапраўды прыцягнулі значную ўвагу сталічнай інтэлігенцыі, моладзі. Было мноства замежных гасцей і выканаўцаў: выступілі вядомы перфармансісты Войцэх Стэфанік і Ноэль Маллой. Нягледзячы на адсутнасць у Беларусі трывалых традыцый перформансу, айчынныя аўтары таксама паказалі высокі ўзровень майстэрства. Цікавасць публікі выклікалі кампазіцыі Віктара Пятрова, Мітрыча, Аляксандра Родзіма, перформанс групы "N.R.M". Трагічным аптымізмам уразіў твор перформер-групы Зміцера Вішнёва "Культ асобы".

Галоўная бяда многіх айчынных аўтараў — залішне песімістычная афарбоўка прадстаўленых перформансаў, а падчас і дэструктыўны пачатак у іх аснове. Кампазіцыі нярэдка перадавалі светаадчуванне паднявольнага чалавека. Было мала светлых ідэй. Наогул не было вясёлых перформансаў. Перфоманс — перш за ўсё гульня, ён павінен весяліць чалавека, прыносіць яму радасць. Далёка не ўсе прысутныя былі цалкам задаволены ўбачаным.

Але не трэба забывацца, што фестываль "Навінкі-99" — гэта толькі пачатак. І новая галіна мастацтва, безумоўна, мае будучыню на беларускай глебе...

Аляксандр АДЛІВАНЧЫК.

Личная переписка

Америка – страна парадоксов

(Продолжение. Начало в №170.)

Письмо второе

Адаптация

Бруклин, 15 сентября 1996 года.

Здравствуйте, Лариса и Виктор!

Вот уже полгода, как мы в Штатах.

